УДК 316:130.123.4(438+476)

# ПРАБЛЕМА ІДЭНТЫФІКАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА КУЛЬТУРНАГА ПАМЕЖЖА

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У гісторыі культуры існуюць перыяды, калі працэсы матэрыяльнай і духоўнай творчасці ў кантэксце цесных гістарычных стасункаў рыхтуюцца сумеснымі намаганнямі розных народаў. І нават асобная творчая індывідуальнасць уяўляе сабой комплекс поліэтнічных рыс і прыкмет.

У гэтых адносінах вельмі паказальны прыклад – культура Беларусі XIX стагоддзя. Культурныя здабыткі і постаці гэтага перыяду складана ідэнтыфікуюцца ў кантэксце нацыянальнага жыцця. У складзе Расійскай імперыі беларуская культура развівалася ў рэчышчы вострага супрацьстаяння інтарэсаў Расіі і Польшчы, якія прэтэндавалі на беларускія духоўныя каштоўнасці, залічваючы іх у сваю ўласнасць. У культурнай прасторы Беларусі шырока практыкавалася польская мова, як спадчына Рэчы Паспалітай, і руская мова, якая ўкаранялася ў публічны ўжытак як ідэалагічны інструмент з боку царызму. Польскі і рускі грамадскія кірункі падтрымліваліся адпаведна каталіцызмам і праваслаўем [1]. Беларуская ідэя, якая першапачаткова трымалася за уніяцтва, а пазней схілялася да каталіцызму, што падтрымліваў вызваленчы рух, пачыналася з рамантызацыі Літвы і яе гераічнага мінулага, паэтызацыі народнай культуры.

Аднак гэта ідэя працавала таксама і на польскае нацыянальнае адраджэнне. Ва ўмовах інтэнсіўнай інтэграцыі вызваленчага руху падняволеных народаў імперыі стваралася беларуска-польскае культурнае памежжа з спецыфічнымі культурна-асветніцкімі ідэямі і польскай мовай ў творчым ужытку [4]. Гэта акалічнасць становіцца вельмі істотнай асаблівасцю развіцця культуры Беларусі гэтага перыяду.

Спалучэнне полінацыянальных элементаў у пэўных артэфактах і падзеях беларускага культурнага жыцця набывае характар моцнага сінтэзу і вельмі ўскладняе пытанне аб іх прыналежнасці да той ці іншай нацыянальнай культуры. Асабліва гэта датычыцца пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, чыя творчасць сінтэзавала своеасаблівыя культурныя ўласцівасці featureрознага нацыянальнага паходжання [2].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Узнікаюць лагічныя пытанні, да чыей культуры трэба адносіць паэта А. Міцкевіча, кампазітараў С. Манюшку і М. Ельскага, мастакоў К. Альхімовіча і Я. Дамеля і іншых.

Існуе меркаванне, што ўвогуле не зусім карэктна так ставіць пытанне. Трэба прызнаць, што гэтыя творчыя асобы – прадстаўнікі беларуска-польскай культурнай супольнасці, і гэтым абмежавацца. Аднак польскія даследчыкі адназначна адносяць такія постаці да сваёй нацыянальнай культуры. Стэрэатыпна трактуюць гэтае пытанне і многія расійскія навукоўцы. У выніку беларуская культурная спадчына, паводле такіх спрошчаных трактовак страціла значную колькасць творчых дзеячоў. Можна прыгадаць І. Аляшкевіча, Ч. Янкоўскага, І. Даніловіча, Ф. Рушчыца, дзейнасць якіх апынулася па-за межамі беларускай нацыянальнай культурнай прасторы. Абсурднасць такой сітуацыі таксама вымагае пастаноўкі праблемы ідэнтыфікацыі нацыянальных культурных каштоўнасцей. Біэтнічнасць ці паліэтнічнасць культурнай з'явы прадугледжвае неабходнасць яе грунтоўнага аналізу, у тым ліку высвятлення яе этна-нацыянальнага падмурку.

Можна вылучыць цэлы шэраг крытэрыяў, якія дапамагаюць вызначыць прыналежнасць творчай асобы да культуры таго ці іншага народу. Для літаратараў гэта, найперш, мова твораў, яе рэгіянальна-стылістычныя асаблівасці. Для кожнай мастацкай асобы – гэта змест творчасці, яе тэматыка і праблематыка, матэрыял, які аўтар выбірае і з якім працуе, ідэйная скіраванасць, што выяўляе светапогляд творцы, вызначае сістэму яго адносін да жыцця, стаўлення да існуючых праблем і падзей [4]. Немалаважнае значэнне мае фактар радзімы, этнічная прыналежнасць творцы, яго этна-нацыянальная самаідэнтыфікацыя, выхаванне і працягласць знаходжання ў пэўным асяродку. Гэтыя і шэраг іншых паказчыкаў павінны ўлічвацца, калі сур'ёзна ставіць пытанне ідэнтыфікацыі мастака і народа, мастацкай творчасці і нацыянальнай культурнай спадчыны. У гэтых варунках аб'ектам даследавання могуць быць такія значныя постаці культуры XIX стагоддзя, як, напрыклад, А. Міцкевіч, С. Манюшка, К. Альхімовіч, Э. Ажэшка. Іх мастацтва і інтэлектуальна-творчая дзейнасць моцна ззаангажаваная на ліцвінскіх, краёвых інтарэсах. Аднак згодна з традыцыйнымі навуковымі падыходамі гэтыя асобы разглядаюцца ў кантэксце польскай культурна-мастацкай традыцыі [4].

Што датычыць артэфактаў культуры – замкаў, храмаў, палацаў, то пра іх нацыянальную прыналежнасць шмат што гаворыць месцазнаходжанне, бо ўзвядзенне будынкаў было патрэбай часу і пэўнага ўласніка ці грамадскай супольнасці гэтай зямлі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Значным крытэрыем ідэнтыфікацыі з'яўляецца мастацкі стыль. Помнікі беларускай готыкі, барока ці народнай архітэктуры адназначна сведчыць пра іх культурны кантэкст. Нават цэрквы рускага стылю, што распаўсюджваюцца ў Беларусі, пачынаючы з XIX стагоддзя, маюць свой мясцовую самабытнасць [3]. Храмы ж іншых рэлігій – мусульманскай, іудзейскай, што будаваліся мясцовымі жыхарамі, становяцца неад'емнай часткай культурнай прасторы Беларусі.

Такім чынам, культурныя помнікі на беларускай зямлі – яе духоўная і матэрыяльная спадчына. Аднак гэтая ісціна не выключае існавання праблемы культурнага памежжа і актуальнасці даследавання праблемы ідэнтыфікацыі нацыянальных культурных каштоўнасцей.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.
2. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі / С. А. Падокшын. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 315 с.
3. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 444 с.
4. Пяткевіч, А. М. Старонкі спадчыны:культурнае памежжа Гродзеншчыны / А. М. Пяткевіч. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. – 240 с.

УДК 930(476) “18”

# СОЦИАЛЬНО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ ИСТОРИЯ КРЕСТЬЯНСТВА БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ КОНЦА XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XIX В. В ОСВЕЩЕНИИ В. А. СОСНО

**Белова О. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

В отечественной историографии истории крестьянства в советский период основное внимание уделялось исследованию социально-экономического положения белорусских крестьян. В наши дни историки все больше обращаются к более всестороннему изучению социально-политических аспектов истории белорусского крестьянства, в т. ч. его роли в значимых политических событиях отечественной истории данного периода. Кроме того, на современном этапе рассмотрение социально-политических аспектов истории крестьянства характеризуются сменой методологических подходов и расширением тематики исследований.

Большой вклад в изучение вопросов формирования сословно-группового состава крестьян белорусских губерний в конце XVIII - первой половине XIX века внес белорусский исследователь В. А. Сосно. В



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ